З першых вуснаў

# «Рынкі адкрыты — проста трэба варушыцца»

## У Беларусі можа быць створаны Саюз кандытараў

**Такая навіна — адзін з вынікаў учарашняй нарады ў Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Сустрэча стала першай пасля назначэння на некаторыя пасады новых кіраўнікоў, калі ім былі дадзены канкрэтныя даручэнні. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў чыноўнікаў быў час знутры вывучыць адпаведныя галіны эканомікі, разабрацца з поспехамі і праблемамі, таму падчас даклада пажадаў пачуць іх меркаванне аб перспектывах развіцця, даведацца аб праблемах у харчовай і перапрацоўчай прамысловасцях, іх рашэнні і патрэбы ў дапамозе на ўзроўні ўрада і Прэзідэнта.**



Фота БелТА.

Прыём збожжа новага ўраджаю на Віцебскім камбінаце хлебапрадуктаў.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў: праз пандэмію каранавіруснай інфекцыі больш за паўгода нашы прадпрыемствы працуюць у няпростых умовах. Але, нягледзячы на гэта, Беларусь здолела захаваць рабочыя месцы і экспартны патэнцыял.

«Наша сістэма перапрацоўкі якраз абсалютна не звязана ў адмоўным плане з каранавірусам. Сыравіны ў вас было больш чым дастаткова, сяляне працуюць як ніколі добра, ёсць мяса, малако, цукар і іншае. ***Усе краіны закрыліся і сваю эканоміку спынілі — мы працавалі. Наперад, прадавайце***. Рынкі адкрыты — проста трэба варушыцца. Як мне дакладваюць міністр сельскай гаспадаркі, віцэ-прэм'ер, праблем са збытам прадукцыі няма. Трэба ўзмацняцца», — заклікаў кіраўнік дзяржавы.

Тым не менш павелічэнне экспарту застаецца вельмі важным кірункам. Экспартныя пастаўкі ў Кітай — асобнае пытанне Аляксандра Лукашэнкі.

Прэзідэнт адзначыў, што айчынныя сельгаспрадпрыемствы атрымалі добры ўраджай збожжа, агароднiны і садавіны.

«Усё перапрацаваць да міліграма. Страт не павінна быць ніякіх. І яшчэ адна задача: у насельніцтва таксама ёсць неблагі ўраджай — гэта добрая падмога. Калі мы хочам, каб насельніцтва на сваіх участках прысядзібных і іншых вырошчвала сельгаспрадукцыю, яе трэба выкупіць у людзей. ***Лішкі сельгаспрадукцыі трэба выкупіць у насельніцтва»,*** — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і пацікавіўся перапрацоўкай садавіны і агародніны.

Асобна цікавіць Прэзідэнта пытанне перапрацоўкі рапсу, рынкі яго збыту і цэны.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час дзяржава падтрымала прадпрыемствы кандытарскай і цукровай галін, быў створаны холдынг «Мінск Крышталь».

«Прыняты шэраг кадравых змяненняў. Як выконваюцца задачы, якія тады былі пастаўлены? Як асвойваюцца новыя рынкі збыту?» — заклапочаны Прэзідэнт.

Цікавіў яго і стан спраў з кадрамі ў галінах, якія курыруюць удзельнікі сённяшняй нарады: ці хапае кваліфікаваных спецыялістаў.

Анатоль Бубен, старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам», у склад якога ўваходзяць 42 арганізацыі, далажыў кіраўніку дзяржавы, што за першае паўгоддзе выкананы ўсе даведзеныя паказчыкі эфектыўнасці працы канцэрна. Экспарт выкананы на 105 працэнтаў. За паўгоддзе дадалі 18 краін — сёння пастаўкі ажыццяўляюцца ў 58 дзяржаў свету.

«Пачата дзейнасць па арганізацыі гандлёвага прадстаўніцтва ў Кітаі», — паведаміў старшыня Белдзяржхарчпрама.

Па словах Анатоля Бубена, з першых дзён пандэміі ў кожнай вобласці Беларусі на базе спіртзаводаў арганізавана вытворчасць дэзінфіцыруючых сродкаў, патрэба краіны ў антысептыках была закрыта цалкам.

### Кандытары, аб'ядноўвайцеся

Як расказаў журналістам старшыня Белдзяржхарчпрама, цана цукру на сусветным рынку рэзка знізілася. Таму канцэрн працуе над зніжэннем сабекошту.

«Пpaглядаем цану 350 долараў за тону ў параўнанні з цаной папярэдняга сезона 500 долараў — ужо «адшукалі» 150 долараў. У наступны год будзем уваходзіць з перапрацаваным новым цукрам, які дазволіць канкурыраваць на знешнім і ўнутраным рынку», — праінфармаваў Анатоль Бубен.

Што да кандытарскай галіны, то старшыня канцэрна бачыць неабходным стварэнне адпаведнай карпарацыі, якая магла б скласці канкурэнцыю міжнародным аб'яднанням.

«Мы павінны ў кандытарскай галіне, як прапанаваў Прэзідэнт, стварыць Саюз кандытараў. Мо і зробім літаральна ў найбліжэйшы час, каб яны каардынавалі і бачылі рынкі, накіроўвалі развіццё сваёй галіны», — паведаміў кіраўнік канцэрна.

Ён праінфармаваў, што ў краіне нарыхтоўваецца 70 тысяч тон піваварнага ячменю пры патрэбе каля 120 тысяч тон. Астатняе закупляецца — а гэта дзясяткі мільёнаў долараў. Таму Прэзідэнт даручыў, каб налета Белсолад быў забяспечаны ячменем айчыннай вытворчасці цалкам. Анатоль Бубен выказаў упэўненасць, што даручэнне будзе выканана.

На дакладзе пацверджана правільнасць рашэння аб стварэнні алкагольнага холдынгу.

«Усё ўрэгулявана, кваціравана, усё пад кантролем», — запэўніў Анатоль Бубен.

У канцэрне бачаць шляхі развіцця, нарошчваюць у першую чаргу экспарт. Першыя дзесяць тысяч тон цукру хутка будуць адгружаны ў Кітай — упершыню. Ёсць кантракт на наступныя дзесяць тысяч тон.

«Цукар да канца сезона ўвесь распісаны патонна з заводаў», — абмаляваў Бубен становішча з рэалізацыяй прадукцыі.

Галоўнае, чаго па выніках даклада запатрабаваў Прэзідэнт, — дысцыпліна на месцах, парадак і адказнасць канцэрна, у тым ліку за прадпрыемствы харчовай прамысловасці іншай формы ўласнасці.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Шлях насілля непрымальны для беларускага народа

## Аб гэтым гаворыцца ў заяве членаў Савета Рэспублікі і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў

Парламентарыі катэгарычна асуджаюць спробы нешматлікіх ангажыраваных груп раскалоць грамадства і дэстабілізаваць сітуацыю ў краіне. «Нельга дапусціць, каб моладзь Беларусі стала разменнай манетай у жаданні расхістаць сітуацыю. Кожны грамадзянін абавязаны выконваць законы, а дзяржава — забяспечваць правапарадак і спакой. Дзеянні праваахоўных органаў адэкватныя правакацыям удзельнікаў несанкцыянаваных акцый. Шлях насілля непрымальны для беларускага народа», — падкрэсліваюць у парламенце.

Заява прынята па выніках выбараў Прэзідэнта Беларусі, якія адбыліся 9 жніўня. Парламентарыі падзякавалі ўсім грамадзянам, якія прынялі ўдзел у гэтай найважнейшай падзеі. «Актыўнае датэрміновае галасаванне і высокая яўка ў дзень выбараў чарговы раз прадэманстравалі неабыякавасць беларусаў да будучыні краіны і гатоўнасць узяць на сябе адказнасць за яе лёс. Абсалютная большасць грамадзян падтрымлівае дзеючы курс на будаўніцтва моцнай незалежнай дзяржавы, ключавым прыярытэтам якой з'яўляецца чалавек, яго дабрабыт і бяспека», — адзначаецца ў заяве.

# КАЛЕКТЫЎ МАЗа ПРАЦУЕ СТАБІЛЬНА

## Заявіў учора генеральны дырэктар прадпрыемства журналістам

**У некаторых тэлеграм-каналах з'явілася інфармацыя пра забастоўкі на найбуйнейшых заводах краіны. З гэтай нагоды кіраўніцтва некаторых з іх запрасіла ў свае цэхі прадстаўнікоў СМІ.**



Фота БелТА.

«На сённяшні дзень МАЗ працуе вельмі напружана, у нас па аўтобуснай вытворчасці тры змены, маецца шмат заказаў, асабліва экспартныя: Расійская Федэрацыя, Украіна. Канвеер працуе ў дзве змены. Ёсць рэалізацыя. Калектыў настроены па-баявому, ніякіх хваляванняў, панікёрскіх настрояў няма, абсалютна нармальныя, рабочыя задачы, усе разумеюць для сябе тое, што будучае людзей, іх сям'яў — у нашай працы, таму абсалютна ўсё нармальна і штатна», — пракаментаваў сітуацыю на Мінскім аўтамабільным заводзе **генеральны дырэктар ААТ «МАЗ — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» Валерый ІВАНКОВІЧ.**

Кіраўнік прадпрыемства дадаў, што разам з прафсаюзам пастаянна сустракаецца з калектывам на ўсіх узроўнях, штотыднёва — з актывам прафсаюзнай арганізацыі, раз на месяц — з усім працоўным калектывам. На тыдні перад выбарамі было дзве сустрэчы з працоўным калектывам і актывам прадпрыемства.

«Мы абмяркоўваем шчыра, адкрыта ўсе пытанні — папулярныя і непапулярныя, я нефармальна гутару, абстаноўка ў калектыве стабільная, калектыў працуе і падтрымлівае той выбар, які зрабіла краіна, — сказаў ён. — Мы за Беларусь, мы за квітнеючую Беларусь».

Сёлета на заводзе сабрана ўжо 5300 аўтамабіляў (летась за той жа перыяд было зроблена 5100). На 170 мільёнаў долараў адгружана прадукцыі ў розныя краіны свету. Сярэдні заробак за першае паўгоддзе склаў 1200 рублёў.

«Задачы напружаныя, абавязацельствы вялікія, і нам трэба працаваць», — рэзюмаваў генеральны дырэктар.

У прысутнасці журналістаў Валерый Іванковіч звярнуўся да калектыву:

«Вы мяне ведаеце, я ваш кіраўнік і нясу адказнасць за вашу бяспеку, вас, вашых сем'яў і вашых блізкіх. Не трэба паддавацца на тыя правакацыі, якія адбываюцца. Не трэба падзяляць людзей... Мы заўсёды жылі мірна, працавалі, выконвалі сур'ёзныя задачы і разумелі, што наш хлеб у нашым заробку і нашых мазалістых руках».

Працуе ў штатным рэжыме і БелАЗ, расказаў журналістам **выконваючы абавязкі кіраўніка прадпрыемства Алег СЦЯПУК.**

Інфармацыю пра забастоўку супрацоўнікаў абвергла і прэс-служба Інстытута хіміі новых матэрыялаў Нацыянальнай акадэміі навук, паведаміла БелТА.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**